***Е. В. Башлыкова***
*Науч. рук.* ***И. Н. Афанасьев,***
*канд. филол. наук, доцент*

## ПОЭЗИЯ И СУДЬБА КОНСТАНТИНА СИМОНОВА В ЗЕРКАЛЕ СТИХОТВОРЕНИЯ «ЖДИ МЕНЯ»

Поэзия периода Великой Отечественной войны – это поэзия судьбы. Именно поэзия стала первым серьезным приобретением литературы в военный период в отличие от романа или повести. Лирические стихотворения помогали преодолеть невзгоды в человеческом сопереживании. Созвучием судеб автора, читателей и героев объясняется большой успех поэзии К. Симонова.

В сокровищницу фронтовой поэзии К. Симонова входит его стихотворение «Жди меня». Событийную основу произведения обусловили личная судьба автора, его любовь к актрисе Валентине Серовой. «Жди меня» – это по-житейски простая и понятная фраза, звучащая как своеобразное заклинание, как «Аминь» в молитве, без которого всё произведение утратило бы общую эмоциональную направленность и целостность.

С одной стороны, стихотворение выступает как нечто личное и сакральное, предназначенное только для двоих, а с другой стороны, оно открывает целый мир, показывая всю его масштабность. В этом произведении К. Симонов изобразил актрису как символ верности. Но для В. Серовой это было тяжелым грузом, с которым она так и не смогла справиться, поскольку не умела ждать. Именно поэтому К. Симонов выразил в стихотворении то, чего у него не было в реальной жизни, но о чем он мечтал и тосковал. По его словам, «желтые дожди» в стихотворении – это выражение его тоски:

Жди меня, и я вернусь.
Только очень жди,
Жди, когда наводят грусть
Желтые дожди [1, с. 158].

Можно сказать, что сюжет стихотворения состоялся еще до войны как сюжет жизни самого поэта. Для историков литературы важно иметь в виду сложную историю взаимоотношений К. Симонова и В. Серовой. Эта история выходит за рамки событий войны, именно благодаря этому К. Симонову удалось создать во время войны произведение, которое стало эталоном любовной лирики на все времена.

### Литература

1 Симонов, К. М. Собрание сочинений : в 10 т. / К. М. Симонов. – М. : Художественная литература, 1979. – Т. 1. – 670 с.

***Я. У. Васіленка***
*Нав. кір.* ***Л. В. Паплаўная,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СУБСТАНТЫЎНАЯ МЕТАФАРА І ЯЕ ТЫПЫ Ў ПАЭТЫЧНАЙ МОВЕ Я. ЯНІШЧЫЦ

Мова твораў Я. Янішчыц з'яўляецца яскравым прыкладам метафарычнасці. Праз раскрыццё ўласнага светабачання выяўляецца эмацыянальна-экспрэсіўная вобразнасць, што з'яўляецца адметнай рысай творчасці Я. Янішчыц.

Паэтычная мова Я. Янішчыц багатая на вонкавападабенчы тып метафар, якія выяўляе мноства падабенстваў прадметаў, уласцівасцяў і з'яў рэчаіснасці паводле знешняга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падабенства: *кругі расстання* [1, с. 80], *груд падушкі* [1, с. 244], *стужкі промняў* [1, с. 48].

Квантатыўныя метафары выражаюць колькасць, памеры чаго-небудзь: *у сто першым, у стотысячным радзе* [1, с. 256], а таксама выкарыстоўваюцца назоўнікі, якія падвяргаюцца гіпербалізацыі: *стагоддзі жыцця* [1, с. 11].

Псіхалагічныя метафары скіраваны на выяўленне душэўнага стану лірычнай гераіні: *шчасця сляды* [1, с. 173]; *навальніца ўдач* [1, с. 17], *пралеска пяшчоты* [1, с. 193], *дэпрэсія дыхання* [1, с. 188].

Праз асабістае светабачанне аўтара ў паэтычнай мове рэалізуюцца індывідуальна-аўтарскія метафары, якія надаюць слову высокую ўзнёсласць, выразнасць і непаўторнасць: *век суровай прозы* [1, с. 232], *капрыз маленства* [1, с. 296], *кахання сад* [1, с. 300]; *калодзеж памяці* [1, с. 154].

Метафара ў паэтычнай мове Яўгеніі Янішчыц служыць для стварэння больш экспрэсіўнага і эмацыянальнага вобраза, які ўплывае на чытача і дапамагае глыбей зразумець аўтарскую задуму.

**Літаратура**

1 Янішчыц, Я. І. Пачынаецца ўсё з любві…: вершы, паэмы / Яўгенія Янішчыц. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 339 с.

***В. І. Глузд***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

## СПРОБЫ КАМІЧНАГА АСЭНСАВАННЯ РЭЧАІСНАСЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ М. МАРОЗІКА і Ф. ТАПЧЭЎСКАГА

У філалагічнай навуцы нярэдка назіраецца змешванне форм і прыёмаў камічнага, спектр якіх вельмі вялікі. Неправамерна, да прыкладу, ставіць у адзін шэраг як фактары аднаго парадку насмешку, гіпербалізацыю (і яе віды – гратэск, карыкатуру, пародыю, фантастыку), камічную дэталь і інтрыгу, камічную сітуацыю, кантраст, каламбур і г. д.

Літаратура канца XIX ст. характарызуецца разнастайнасцю ва ўвасабленні сродкаў камічнага. Паэзія Ф. Тапчэўскага ў многім падобная да паэзіі Ф. Багушэвіча.

Галоўным героем вершаў абодвух творцаў выступае селянін, тут усё мераецца добрым розумам і звыклымі меркамі мужыка.

У творы "Панскае ігрышча" пры апісанні панскага моднага адзення Ф. Тапчэўскі свядома выкарыстоўвае эфект стылёвага зніжэння. Спектр сродкаў камічнага тут даволі шырокі: параўнанні, выклічнікі, прастамоўныя выразы і вульгарызмы, камічная таўталогія, травестацыя, няправільнае словаўтварэнне і інш.

У вершы "Ён і яна" праз падобны спектр прыёмаў паказваецца збянтэжанасць сялянскага хлопца, які не можа зразумець ні форму прызнання ў любові, ні паводзіны закаханых.

У паэме М. Марозіка "Сцяпан і Таццяна" таксама ў гумарыстычнай форме паказваюцца ўзаемадачыненні мужчыны і жанчыны. Гэта фактычна адна з першых спробаў паказу такіх адносін у беларускай літаратуры.

Галоўныя героі – сялянскія хлопец і дзяўчына сваёй трагедыяй нагадваюць шэкспіраўскіх Рамэа і Джульету, але ключавая сцэна нечаканага вяртання бацькоў падаецца ў межах традыцый народнай смехавой культуры. Адной з прыкмет дачынення твора да травесціі тут з'яўляюцца камічна абы-граныя сітуацыі (напрыклад, у сцэне,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ